# На практычных занятках

Станочны цэх Салігорскага горнахімічнага тэхнікума. Кожны студэнт стаіць на сваім рабочым месцы, кожны атрымаў заданне.

Раўнамерна ідзе стружка з-пад разца ў Яўгена Ждановіча. Ён лічыцца лепшым токарам. Недарма яму даручылі заказ аўтабазы № 5 — зрабіць тры тысячы шпілек.

Цікава праходзяць заняткі і ў слясарным цэху. Тут студэнтаў навучае майстар Васіль Антонавіч Рубчэня. Паспяхова авалодваюць слясарнай справай студэнты Міхаіл Шуневіч, Леанід Крываблоцкі і многія іншыя.

Пройдзе колькі год, і сённяшнія студэнты пойдуць на вялікую будоўлю.

**А. ДУНЕЦКІ,**
**студэнт другога курса Салігорскага горнахімічнага тэхнікума.**

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСК